Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 28 (641) Пятніца, 30 верасня 1966 года. Год выдання XIX. Цана 2 кап.



**1.** На доўга застанецца ў памяці студэнтаў-цалiннiкаў нашага універсітэта цікавая і радасная сустрэча з вядомым усяму свету пісьменнікам Міхаілам Аляксандравічам Шолахавым. Матэрыял аб гэтай сустрэчы чытайце на 4-ай старонцы.

**2.** Дваццаць вераснёўскіх дзён студэнты універсітэта працавалі ў розных калгасах і саўгасах Мінскай вобласці. Яны сабіралі багаты ўраджай бульбы, дапамагалі працаўнікам вёскі ў будаўніцтве і нарыхтоўцы кармоў. На гэтым здымку вы бачыце (злева направа) лепшых студэнтак Святлану Сасс, Ларысу Раманенка, Іну Клыгу, і Святлану Бацечка. Рэпартаж аб працоўных буднях студэнтаў надрукаваны на 3-яй старонцы.



## ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ТРЫМАЮЦЬ ЭКЗАМЕН

*Т. Я. Дударава, сакратар парткома*

Пярвічныя партыйныя арганізацыі прышлі да важнай падзеі ў сваім жыцці: пачаліся справаздачна-выбарчыя сходы. Гэта першыя справаздачы і выбары пасля XXIII з'езда КПСС, у чым іх асаблівасць і значэнне. У аснове размовы на кожным сходзе будзе работа партыйных арганізацый над ажыццяўленнем рашэнняў з'езда, мабілізацыя выкладчыкаў і студэнтаў на выкананне пастановы партыі і ўрада «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі спецыялістаў і ўдасканаленню кіраўніцтва вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй у краіне».

Пакуль што ва універсітэце адбылося толькі тры справаздачна-выбарчыя сходы: на гістарычным і падрыхтоўчым факультэтах і партыйнай арганізацыі адміністрацыйна-гаспадарчых работнікаў. Але ўжо можна меркаваць, які вялікі ўплыў аказалі рашэнні XXIII з'езда партыі на дзейнасць камуністаў універсітэта. Расце актыўнасць партыйных арганзіацый, павышаецца іх роля ў барацьбе за ўздым навуковай і педагагічна-выхаваўчай работы сярод студэнцтва. Сходы і падрыхтоўка да іх сведчаць аб узросшай адказнасці камуністаў за стан спраў у сваёй арганізацыі і ва універсітэце ў цэлым.

Пярвічным партыйным арганізацыям даводзіцца штодзённа вырашаць самыя разнастайныя пытанні. Але сярод іх ёсць, зразумела, галоўныя, на якіх сканцэнтроўваецца асноўная ўвага. Для партыйных арганізацый універсітэта такім асноўным пытаннем з'яўляецца барацьба за павышэнне якасці выкладання, вучобы і выхавання. Таму пажадана, каб гэтыя пытанні былі ў цэнтры ўвагі справаздачна-выбарчых сходаў. Зразумела, што глыбока ўскрыць недахопы ў нашай рабоце, указаць шляхі, па якіх нам належыць ісці, можна толькі тады, калі ў абмеркаванні справаздач прымуць удзел дзесяткі і дзесяткі камуністаў. Між тым, як адзначалася на справаздачна-выбарчых сходах, асобныя камуністы мала выступаюць на партыйных сходах, не ўносяць ніякіх прапаноў і ўся іх «дзейнасць» у партыйных арганізацыях абмяжоўваецца ўдзелам у галасаванні рэзалюцый. Такія камуністы павінны быць падвергнуты рэзкай крытыцы.

Агульнавядома, што поспех партыйных арганізацый у вырашэнні пастаўленых задач знаходзіцца ў прамой залежнасці ад узроўню ідэйна-палітычнай работы. Таму вельмі неабходна, каб на партыйных сходах у поўны голас ішла размова аб арганізацыі тэматычных вечароў студэнтаў, навуковых канферэнцый, усемагчымых дыспутаў, сустрэч са славутымі людзьмі—Героямі Савецкага Саюза і Героямі Сацыялістычнай Працы. Побач з гэтым трэба, каб знайшлі самае шырокае адлюстраванне пытанні паляпшэння ўмоў працы, вучобы, побыту і адпачынку студэнтаў і выкладчыкаў.

Але нельга забываць, што для таго, каб справаздачы і выбары праходзілі пры высокай актыўнасці камуністаў, да іх трэба загадзя і ўсебакова рыхтавацца. На іх павінна гучаць вострая і дзелавая крытыка і самакрытыка. Немалаважнае значэнне тут мае змест даклада. Высокую актыўнасць камуністаў выкліча толькі той даклад, дзе ёсць грунтоўны аналіз работы, паказаны недахопы і іх прычыны, выказваюцца новыя думкі і прапановы. Такі даклад можа быць толькі тады, калі ў яго падрыхтоўцы будзе ўдзельнічаць уся партыйная арганізацыя.

На справаздачна-выбарчых сходах павінна быць удзелена самая сур'ёзная ўвага выбарам у партыйныя бюро самых ініцыятыўных і дзелавых камуністаў. Тут не месца паспешлівасці, бо дзейнасць кожнай партыйнай арганізацыі ў немалой ступені залежыць ад таго, хто яе ўзначальвае, хто кіруе работай камуністаў.

Толькі пры ўмове, калі справаздачна-выбарчыя сходы пройдуць па-дзелавому, пры высокай актыўнасці камуністаў, яны будуць садзейнічаць далейшаму павышэнню ролі пярвічных партыйных арганізацый у вырашэнні задачы камуністычнага будаўніцтва.

**У ПАРТЫЙНЫМ КАМІТЭЦЕ**

## СЛАЎНЫМ ЮБІЛЕЯМ—ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ

На паседжанні партыйнага камітэта нашага універсітэта, якое адбылося на днях, абмяркоўваліся найбольш актуальныя праблемы, якія трэба вырашыць прафесарска - выкладчыцкаму калектыву і студэнтам у новым навучальным годзе. У прыватнасці, дэталёва разгледжан разгорнуты план палітыка-выхаваўчай і культурна-масавай работы. Цэнтральнае месца ў ім займаюць мерапрыемствы, накіраваныя на «выхаванне высокакваліфікаваных, ідэалагічна загартаваных спецыялістаў, адданых Радзіме, партыі, народу, здольных рухаць уперад навуку і тэхніку, быць актыўнымі змагарамі за пабудову камунізма ў нашай краіне».

Уся работа, як адзначалася на паседжанні парткома, павінна праводзіцца пад дэвізам дастойнай сустрэчы слаўных юбілеяў — 50-годдзя Савецкай улады і 100-годдзя з дня нараджэння Ул. І. Леніна. Гэтым падзеям будуць прысвечаны тэматычныя навуковыя канферэнцыі, лекторыі, сустрэчы, студэнцкія вечары, літаратурныя дыспуты. Важнае месца ў плане адводзіцца выхаванню маладых спецыялістаў на лепшых традыцыях універсітэта, горада і рэспублікі. З гэтай мэтай вырашна арганізаваць выстаўку, прысвечаную гісторыі універсітэта, стварыць стэнды для студэнтаў-выдатнікаў, лепшых работнікаў. Будзе створаны таксама пакой баявой славы, аформлена мемарыяльная дошка памяці прафесароў, выкладчыкаў, аспірантаў, студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта, якія аддалі сваё жыццё ў барацьбе за сацыялістычную Радзіму.

Партыйны камітэт і рэктарат рэкамендавалі вучоным падрыхтаваць шэраг артыкулаў, брашур па тэматыцы «Вялікі Ленін і Беларусь». Прызнана таксама неабходным разгарнуць шырокі збор матэрыялаў для кнігі «Іх выхаваў Беларускі дзяржаўны універсітэт імя Ул. І. Леніна».

Пярвічным партыйным арганізацыям ёсць дзе прыкласці свае намаганні.

## ВА УНІВЕРСІТЭТАХ КРАІНЫ

## ДЗІЎНЫ ЛЁС

У нашай краіне маецца звыш 40 універсітэтаў. З сённяшняга нумара наша газета будзе паведамляць аб найбольш цікавых навінах з іх жыцця.

Газета «Дружба», якая выходзіць ва універсітэце імя Патрыса Лумумбы, нядаўна змясціла артыкул, у якім расказваецца пра сустрэчу студэнтаў з танцоўшчыцай Эрай Радкевіч.

Шчасліва складаліся юнацкія гады сібірачкі Эры. Яна скончыла школу-дзесяцігодку, паступіла на мэблевую фабрыку ў Новасібірску і адначасова пачала рыхтавацца для паступлення ў інстытут. І раптам... цяжкая хвароба пазваночніка, цяжкі прыгавор урачоў: два гады нерухома ляжаць на ложку ў бальніцы...

Бясконца доўга цягнуцца дні, думкі ўсё часцей і часцей вяртаюць Эру да дзяцінства. Некалі, яшчэ сямікласніцай, яна выступала ў школьнай самадзейнасці, выконвала індыйскі танец. Пасля, на адным канцэрце яна ўбачыла двух сапраўдных танцораў з Індыі. І дома старалася пераняць убачаныя рухі танца...

Пачаліся штодзённыя заняткі Эры. Яна напісала пісьмо ў Маскву, у Інстытут народаў Азіі з просьбай прысласць ёй кніжкі аб танцавальным мастацтве Індыі... Неўзабаве пасля бандэролі, прышла пасылка з Калькуты. Інжынер А. Е. Джаярам Шэта прыслаў ёй падручнік з малюнкамі па класічнаму рытуальнаму танцу Індыі...

Прайшло два гады. У гэты час у Маскву на гастролі прыехала індыйская танцоўшчыца Тара Чаудры. І Эра садзіцца ў самалёт, каб паспець на прэм'еру, а пасля канцэрту ідзе за кулісы. Тара Чаудры з павагай аднеслася да рускай дзяўчыны, якая вывучала і выконвала індыйскія танцы, згадзілася прысутнічаць на яе рэпетыцыях.

Старанныя заняткі не прайшлі дарэмна. Калі Эра Радкевіч паступіла ў эстраднае вучылішча ў Кіеў, ёй прышлося праходзіць усю трохгадовую праграму: званне артыста ёй прысвоілі пасля чатырох месяцаў вучобы...

Пачаліся гастролі за мяжой. У Ліване, Сірыі, Егіпце гледачы ўбачылі ў яе выкананні грузінскія, цыганскія, негрыцянскія народныя танцы. Але самае вялікае месца ў рэпертуары танцоўшчыцы займалі танцы народаў Індыі.

...У чытальнай зале Універсітэта дружбы народаў імя Патрыса Лумумбы шматгалосна, як і заўсёды. Над вучэбнікамі сядзяць студэнты з вострава Маўрыкій Гхедзі Сахадэу і Рамлал Пакунлал. Для маладога чалавека прадстаіць апошні экзамен, і ён вернецца на радзіму матэматыкам, а дзяўчыне трэба вучыцца яшчэ два гады, каб стаць урачом. Але, нягледзячы на гарачыя студэнцкія дні, яны разам з сябрамі стараюцца сёння пайсці раней: яны спяшаюцца на канцэрт, дзе танцуе Эра Радкевіч. Выпадкова даведаўшыся пра дзіўную гісторыю жыцця танцоўшчыцы, яны пажадалі ўбачыць асабіста яе майстэрства, пазнаёміцца з Эрай бліжэй.

Пяцітысячная канцэртная зала перапоўнена. Эра выконвае рытуальны танец Індыі «Сны нявесты». Цудоўная мелодыя, рытм барабанаў, выдатнае выкананне танца... Гарачыя воплескі прысутных сваёй равесніцы з Сібіры.

**А. ЕЛАНЧУК.**

# прадаўжаецца прац[illegible] семестр

## МАРШРУТ — КАЛГАСЫ МІНШЧЫНЫ

Раніцай, як было дамоўлена, да універсітэцкага гарадка бясконцым патокам з туга набітымі сумкамі прышлі студэнты. Усе былі ў поўнай баявой гатоўнасці, з радасным, бадзёрым настроем. Дзяўчаты, якія прадугледжана пазразалі доўгія пазногці і падвязалі хусцінкі, былі зусім не падобны на ўчарашніх студэнтак...

Хлопцы ў гэты дзень выглядалі надзвычай брава, бо форма адзення ў іх была, хоць куды. У надзягцяваных ботах, з туга падперазанымі паверх бушлатаў раменямі, яны больш нагадвалі палескіх рабінзонаў, чым студэнтаў. А сваіго сябра з гістфака я зусім не пазнаў: на яго галаве сядзела сіняя, з чырвоным абадком і пластмасавым брылем міліцыянерская фуражка. Дзе яму яе ўдалося адшукаць, я і сёння не магу сабе ўцяміць...

І вось падышлі калгасныя грузавікі. Дэканы праверылі гатоўнасць студэнтаў да ад'езду. А ўжо праз некаторы час машыны трымалі кірунак на Сасноўку, на Дзегцяроўку, на Вішнёўку...

У розных кірунках міншчыны нясліся студэнцкія песні. Гэтыя песні падхоплівалі апошнія вырai птушак і неслі далёка-далёка на поўдзень.

Спяшаецца восень, шырэй ахоплівае свае ўладанні. А ў калгасах яшчэ не сабраны багаты ўраджай садавіны, агародніны. Але найбольш за ўсё студэнтаў чакае бульба, тая самая бульба, якая наводзіць добры апетыт і на прафесара і на студэнта. У студэнта ж гэты апетыт узрастае асабліва тады, калі ў яго кішэнях перад самай стыпендыяй застаюцца толькі адны медзякі...

## РАЗВЕДКА

І вось па калгаснай вёсцы пракацілася машына, гаманлівым гуртам павыскоквалі з яе хімікі. Неўзабаве тут сабралася шмат калгаснікаў. На іх тварах—радасць: прыйшла падмога. Завязалася шчырая гутарка:

— Ураджай бульбы добры?

— Ураджай то добры, ды ў полі,—пачулі ў адказ хімікі...

— Нічога, нічога, — мы яе хутка ў капцы ссыплем...

Праз хвіліну нехта падмецціў:

— А клуб у вас ёсць? У нас жа дзяўчат вельмі многа прыгожых, можа б і вяселле праз тыдзень-два згулялі...

— Клуб ёсць,—нявесту нам трэба было б выбрать,—тут брыгадзір падміргнуў калгасным хлопцам, — юнакі нашы сімпатычныя, дый да работы хвацкія, вось толькі, хіба, музыку, каб знайсці?..

Размова дайшла да таго, што хімікі нават згадзіліся адшукаць свайго музыку і нават канцэрт вялікі на вяселлі даць для калгаснікаў, і сватоў са свайго атрада знайсці, толькі ці закусі на ўсіх хопіць?..

— Хопіць, хопіць,—жартавалі жанчыны,—вы ж хімікі, можаце і самагонны апарат нават зрабіць...



*Валодзя Маляўскі пускае ў работу сваю бетонамяшалку.*

## НА ПАЗІЦЫЯХ

Але пяройдзем да біёлагаў, якія ўжо да гэтага часу, разыйшоўшыся роўнай шарэнгай, занялі пазіцыі на бульбяным полі. Закіпела праца. Нягледзячы на тое, што без прывычкі балелі спіны, хлопцы і дзяўчаты працавалі дружна і ўпарта. Адно за адным у кузаў машыны сыпаліся вёдры з бульбай. І толькі адна пара дзяўчат усё больш і больш заставалася недзе ззаду. Гэтыя дзяўчаты ўсё аб нечым гаварылі:

— Глянь, глянь, Света, як ліна цікава расце гэтая бульба,—гаварыла ў захапленні першакурсніца ў чорных капронавых пальчатках, звяртаючыся да сваёй сяброўкі.

— А што тут цікавага. Я ўжо даўно знаёма з гэтай раслінай.

— Дзе ж ты раней яе магла бачыць?

— У сталовай.

Кансіліум сур'ёзных разважанняў можа яшчэ і не закончыўся б, калі б далёка наперадзе іх не аклікнулі:

— Эй, дзяўчаты? Шавяліцеся! Чаго вы так адсталі?

Невядома з якой мэтай, заліхвацка насунуўшы на бікрэнь шапку, да іх падышоў хлопец. Рукі ён трымаў у кішэнях.

— Можа вам дапамагчы, дзяўчаткі? — крыху хвалюючыся запытаў ён.

Дзяўчаты ацэньваючым позіркам агледзелі яго з ног да галавы.

— Ну, станавіся, будзем падбіраць.

Але хлопец, відаць, не надта хацеў гнуцца над гэтай бульбай. І ён прапанаваў:

— Давайце я вам лепш вёдры буду падносіць. А ў якім вы годзе паступілі? — [illegible] ён загаварваць дзяўчатам [illegible]

— Ну хоць бы ў гэтым. А якое гэта мае значэнне?

Юнак крыху пачырванеў.

— А на якім вы курсе? — раптам выпаліў ён.

Дзяўчаты з яшчэ большым здзіўленнем паглядзелі на яго.

Але дыпламатычная размова хутка набыла лірычны характар. Ужо не саромяючыся, хлопец забаўляў дзяўчат дасціпнымі анекдотамі, ад чаго яны, расчуленыя, хіхікалі. І толькі час ад часу ён падносіў да машыны вёдры.

Хутка падышоў час абедаць. Скончыўшы свае барозны, усе пашыбавалі да вёскі. Толькі нашым героям стала неяк зусім сумна. «Памочнік» адразу хацеў рвануць за ўсімі, але яго тут жа супынілі:

— Стоп! Ты ж хацеў дапамагчы нам,—абрушыліся на яго дзяўчаты.—Ану станавіся падбіраць! Цяпер ты нікуды без нас не пойдзеш. Дапамог, называецца, як кашаль хваробе.

— Вось дык папаў у нерат,— думаў ён, чухаючы сваю патыліцу. Але, адчуўшы небяспеку, што можа застацца галодным, хлопец раптам разагнуў сваю спіну і пачаў хуценька збіраць бульбу. І ўжо праз некалькі хвілін яны разам з усімі сядзелі за абедзенным сталом.

## У СТАЛОВАЙ

Брамчыць пасуда. Адзін за адным стаяць студэнты ў чарзе за абедам. 8 кухарак-дзяўчат не паспяваюць наліваць. Ім стараецца дапамагчы дзевяты, загадчык кухоннай гаспадаркі.

На апетыт студэнты не скардзяцца. Добры ў іх апетыт. Ён заўсёды знаходзіцца, калі добра папрацуеш. Усё, што наварылі ўмелыя дзяўчаты, апаражняецца вельмі хутка. Глядзіш— і ўжо талерка пустая. Дзяўчаты, праўда, па невядомай прычыне ядуць значна менш, і надбаўкі ніколі не просяць.

За студэнцкім сталом есці трэба асабліва ўважліва, не аглядацца. Аглянешся—тут жа і бухнуць табе ў суп лыжак дзве солі. І еш тады, як хочаш.

— Хто солі насыпаў?! — нясецца з аднаго кутка.

— Хто лыжку схаваў?! — чуецца з другога.

А пасля — рогат. У студэнцкай сталовай—як ты не круці, усё роўна не ўтрымаешся, каб не засмяяцца. От, ведама, студэнты.

* * *

**Так, у працы і ў вяселлі, хутка праляцела дваццаць дзён калгаснага жыцця. За гэты час зроблена многа. Гэта і сотні тон сабранай бульбы, і адбудаваныя кароўнікі, і шчырыя песні. Зробленага не пералічыш. Аб гэтым толькі могуць засведчыць тоўстыя бухгалтарскія кніжкі ды добрая памяць калгаснікаў. Доўга яшчэ будуць ісці ў адрас камітэта камсамола ці дэканатаў падзякі ад дырэктараў саўгасаў за добрую дапамогу студэнтаў.**

**Надышоў час развітання з калгаснікамі, час ад'езду ў родны універсітэт. І зноў, як і ў час прыезду, студэнты — вясёлыя і жыццярадасныя. Зноў ліецца над краем песня, песня працы, шчасця і маладосці.**

**А. СВОРАБ.**

## З БРАТНІМ ВІЗІТАМ

*Цяжка выказаць радасць, якая перапоўніла сэрцы студэнтаў нашага універсітэта, што ад'язджалі ў госці да братняга чэхаславацкага народа.*

*Вельмі многа можна расказаць пра цёплыя сустрэчы на гасціннай зямлі. Для тлумачэння ўсяго ўбачанага не трэба было перакладчыкаў, бо мовы двух народаў вельмі блізкія, падобныя.*

*Нашы студэнты будавалі бульбасховішча, залівалі бетонам пляцоўкі для гаража. Чэхаславацкія рабочыя з першых дзён заўважылі, што савецкая моладзь гарачая да працы. І галоўнае—гэта заўсёды вясёлыя, дружныя людзі. Усе трыццаць чалавек былі згуртаваны адзінай думкай —старанна працаваць.*

*Працавалі недалёка ад Карлавых Вараў.*

*Прайшло 16 дзён. Нормы перавыкананы. Наперадзе — экскурсія па краіне. Вялікае захапленне ў нас выклікала цудоўная прырода, прыгожыя гарады. Наш шлях ляжаў праз Карлавы Вары, Марыянскія Лазні, Прагу, Брно, Браціславу. Наведалі таксама шмат заводаў. Кожная сустрэча з чэхаславацкімі людзьмі нечым нагадвала мітынгі дружбы і братэрства двух нашых народаў. У Празе студэнты БДУ наведалі музей Ул. І. Леніна, музей К. Готвальда. Пабывалі мы ў гасцях і ў воінаў Чэхаславацкай Арміі. Калі мы ўвайшлі ў казарму, то ўбачылі савецкія і чэхаславацкія сцягі. Гэта нас не магло не ўсхваляваць, нам было ад гэтага радасна і прыемна на душы.*

*У ЧССР у нас засталося многа сяброў, шмат уражанняў і ,галоўнае, засталася назаўсёды ў сэрцы любоў да братняга народа.*

В. ПОЛЯК.



**Вечарэла. Свежы вецярок скалыхнуў асенняе лісце бяроз і... ўсё прыціхла, нібы сабралася паслухаць лірычную студэнцкую песню.**

**НА ЗДЫМКУ: Тамара Бондарава, Аліна Шкода, Валодзя Ваявodскі.**



# АЎТОГРАФ НА ЎСПАМІН

## ШОЛАХАЎ У СТУДЭНТАЎ НАШАГА УНІВЕРСІТЭТА

— Да нас едзе Шолахаў!..

Гэтая радасная вестка маланкай пранеслася па атрадзе «Зубронак», у якім працавалі студэнты аддзялення журналістыкі нашага універсітэта. І ва ўсіх нас з'явілася пачуццё нецярплівага чакання. Хацелася хутчэй быць сведкам сустрэчы з вялікім пісьменнікам, сустрэчы, якая засталася ў памяці на ўсё жыццё, пра якую можна будзе расказаць дома, у Беларусі, сябрам, знаёмым...

Ледзь толькі пачало паднімацца над стэпам сонца, як да калгаснага клуба пад'ехала машына. Сардэчна сустрэлі студэнты любімага пісьменніка. Ён вышаў да іх, як звычайна, крыху строгі, як заўсёды, крыху ўсхваляваны.

Калі дырэктар саўгаса Малдашаў збіраўся ўжо выступіць з прывітальнай прамовай, Міхаіл Аляксандравіч апярэдзіў яго:

— Давайце прасцей,—пры гэтых словах прысутныя ўбачылі знаёмую ўсмешку Шолахава,—прасцей, правядзем, калі хочаце, форум пытанняў і адказаў.

У зале клуба — ніводнага незанятага месца. Забіты праходы. Акрамя нашых студэнтаў, на сустрэчу прышлі рабочыя саўгаса.

Завязваецца шчырая ажыўленая гутарка. Пытанняў — мноства. Міхаіл Аляксандравіч нядаўна прыехаў з Японіі. Ён расказваў аб тым, што на невялікай тэрыторыі японскіх астравоў размясціліся дзве Японіі. Рэакцыйныя колы штурхаюць краіну на змову з амерыканскімі імперыялістамі, на ўдзел у ваенна-палітычных блоках. Японскі народ, дэмакратычная грамадскасць краіны змагаюцца за мір, за тое, каб не паўтарыліся жудасныя ўрокі мінулага.

— А тое, што прагрэсіўная літаратура Японіі прымае самы актыўны ўдзел у барацьбе за мір,—сказаў Міхаіл Аляксандравіч, — гэта ж асабліва радасна. Я думаю, што цяпер для пісьменнікаў усяго свету няма задачы больш высакароднай, чым барацьба за прадухіленне вайны.

...Сустрэча з Шолахавым праходзіла на казахскай зямлі, і, натуральна, прысутных цікавіла думка Міхаіла Аляксандравіча аб казахскай літаратуры.

— Казахская літаратура вялікая. У ёй шмат слаўных імён. Літаратура добрая, вартая народа.

На пытанне нашых студэнтаў аб тым, што ён думае аб беларускай літаратуры, Міхаіл Аляксандравіч сказаў:

— Выдатная беларуская літаратура дала чалавецтву выдатнага паэта Янку Купалу. У нашай краіне шырока вядомы творы Пятруся Броўкі. Беларуская літаратура ёсць чым ганарыцца.




Той-сёй з маладых субяседнікаў запытаўся:

— А што вам падабаецца са сваіх твораў?

— Я больш люблю творы іншых аўтараў...

Цікавая гутарка ішла хутчэй гадзіннікавых стрэлак. Яна надоўга запомнілася ўсім.

**Э. ЛІПНІЦКІ,**
**студэнт 3-га курса адзд. журналістыкі.**

---

КІНО

# БАЛАДА АБ МУЖНАСЦІ

Двое згубіліся ў моры горных махаў. Савецкі салдат у лагерный вопратцы гефтлінга і спяшлівая дзяўчына-італьянка ў такім жа паласатым убранні радуюцца горнаму сонцу, радуюцца свайму першаму каханню. Вакол — цішыня. Блакітнае альпійскае неба шчыра ўсміхаецца закаханым. Але падсвядомае пачуццё небяспекі не пакідае нас.

Фільм «Альпійская балада» (вытворчасць кінастудыі «Беларусьфільм». Сцэнарыст В. Быкаў. Рэжысёр-пастаноўшчык Б. Сцяпанаў) вызначаецца высокім унутраным драматызмам, грамадзянскім пафасам, які не аслабвае да апошняга кадра. Мы сутыкаемся з барацьбой двух супроцьлеглых пачаткаў, двух полюсаў. На адным з іх хлопец з беларускай вёскі Цярэшкі, ваеннапалонны Іван (артыст Станіслаў Любашын) са сваёй спадарожніцай, італьянскай дзяўчынай Джуліяй (артыстка Любоў Румянцава), на другім — замеценыя снегам, непрыступныя альпійскія перавалы і азвярэўшыя ад пагоні эсэсаўцы са зграямі шалёных аўчарак.

Гудзе, надрываецца сірэна. І на ўсю шырыню экрана, на ўвесь балоцісты горны лес — цяжкае, перарывістае дыханне стомленага чалавека. Пагоня. Паратунак адзін — горы. І чалавек бяжыць туды, раздзіраючы твар аб калючы хмызняк, збіваючы аб каменні босыя ногі. А потым напружанне спадае. Енчыць побач перамоджаны ў бязлітасным паядынку нямецкі ваўкадаў, ляжыць чалавек, у якога вось-вось, здаецца, разарвецца ад стомы сэрца. І ў гэтай трывожнай цішыні раздаецца нейкі не натуральны голас Джуліі: «Русо!»

Вобраз Джуліі — несумненны поспех маладой артысткі Любові Румянцавай. На традыцыйным кінафестывалі рэспублік Прыбалтыкі, Беларусі і Малдавіі ёй прысуджана першая прэмія за лепшае выкананне жаночай ролі. На працягу ўсяго фільма вельмі добра прасочваецца дынамічнае развіццё, станаўленне гэтага вобраза. Спачатку — наіўная, гарэзлівая дзяўчына, якая можа, забыўшыся аб небяспецы, зусім блізка ад фашыстаў высунуцца з-за скалы, і потым, у фінале, калі ўжо знікае апошняя надзея на паратунак, пасталеўшая, гордая і мужная патрыётка, сустракае ворага тварам у твар. Джулія— мужны спадарожнік на шляху Івана. Яна прыдае яму больш сілы і ўпэўненасці ў барацьбе са смерцю, у барацьбе за жыццё. Вось яна, каверкаючы рускую мову, спявае «Кацюшу», пяшчотна гладзіць параненую нагу свайго сябра.

Іван не мог застацца абыякавым да гэтай дзяўчыны. Ён горача палюбіў яе.

Нельга быць раўнадушным, калі глядзіш, як у суровы час расцвітае любоў двух юных сэрцаў, як гэтая любоў абрываецца, так і застаўшыся непаражманай.

Памірае Іван у няроўнай сутычцы з фашыстамі, толькі дзякуючы шчасліваму выпадку застаецца жыць Джулія.

Але гледача не пакідае адчуванне нечага светлага, веснавага. І калі над вёскай Цярэшкі, каля двух блакітных азёр, над цікім беларускім краявідам гучаць задушэўныя словы з пісьма Джуліі роднім Івана, словы пра сваё каханне, мы запэўніваемся, што гэтае светлае перамагло. І, як поўны глыбокага зместу сімвал, у акне простай сялянскай хаты паказваецца твар белагаловага вясковага хлапчука, мажліва будучага Івана.

**Л. ДАЙНЕКА,**
**студэнт IV курса аддзялення журналістыкі.**

---

## ПАДАРОЖНІЧАЦЬ ПАВІННЫ ЎСЕ

Ужо стала традыцыяй на геолага-геаграфічным факультэце расказваць пра сваю працу, практычныя занятні, экскурсіі таварышам па вучобе.

Сакратару камітэта камсамола факультэта М. Міхеду, студэнтам 4-га курса А. Счаснаму і С. Лыга пашчаслівілася гэтым летам пабываць у ЧССР. Вядома, кожнаму з нас хочацца бліжэй пазнаёміцца з жыццём братняга чэхаславацкага народа. Таму М. Міхед, А. Счасны і С. Лыга вырашылі афарміць стэнд «Па Чэхаславакіі», дзе шмат фотаздымкаў, якія расказваюць аб цікавых і шчырых сустрэчах студэнтаў нашага універсітэта на чэхаславацкай зямлі.

Практыка нагляднага асвятлення студэнцкіх маршрутаў геолага-геаграфічнага факультэта дае вялікі плён. Яна сведчыць, што на факультэце падарожнічаюць усе.

---

# НА МУЗЫЧНАЙ ХВАЛІ

**Студэнты універсітэта захапляюцца выступленнямі лепшага калектыва мастацкай самадзейнасці — Народнага аркестра народных інструментаў. У гэтым годзе ў яго ўліліся выдатнае папаўненне першакурснікаў, і цяпер ён налічвае ў сваіх шэрагах да 70 чалавек.**

**Сваімі поспехамі аркестр у многім абавязаны свайму энергічнаму і выдатнаму кіраўніку, настаўніку М. А. Лісіцыну, які нязменна вось ужо на працягу больш дзесяці гадоў кіруе калектывам. Ён сочыць заўжды не толькі за творчым ростам сваіх выхаванцаў, ён верны таварыш і дарадчык ва ўсіх выпадках жыцця.**

**За апошнія гады аркестр шмат разоў выязджаў з канцэртамі ў калгасы і саўгасы, на фабрыкі і заводы рэспублікі, а таксама за яе межы. Толькі ў 1965-66 навучальным годзе аркестр пабываў у Лагойску, Салігорску, Жодзіна, Слуцку і Вільнюсе. Быў дадзены вялікі канцэрт на адкрыцці Народнай філармоніі, у якім прынялі ўдзел Народная артыстка СССР Тамара Ніжнікава, Заслужаны артыст рэспублікі Аркадзій Саўчанка, салістка нашага аркестра Людміла Барысаза.**

**У лістападзе 1965 года універсітэцкія ўмельцы выступалі з канцэртамі па тэлебачанню, у красавіку 1966 года па радыё. 40 хвілін чулася музыка ў выкананні нашага аркестра. А ў майскія дні па радыё прагучаў канцэрт-нарыс пра універсітэцкі аркестр.**

**Пасля Трэцяй дэкады вышэйшай і ганаровай ацэнкай выканання калектыва было прысуджэнне яму звання Народнага аркестра.**

**Цяпер у калектыве адказны перыяд — падрыхтоўка да фестывалю мастацкай самадзейнасці, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады. Верасень праходзіць у напружанай працы — рэпетыцыі праводзяцца штодзённа, з аркестрам рыхтуюцца выступіць маладыя салісты, студэнты нашага універсітэта Анатоль Злобіч (гістфак), Жана Манастырская (біяфак), Анатоль Мамінаў (гістфак).**

**У гэтым годзе ў аркестра юбілейны год — 15-годдзе з дня заснавання. У канцы года калектыў дасць юбілейны вялікі канцэрт.**

**В. ЛІТВІНКА.**

---

# УСЕАГУЛЬНАЯ МОВА. ГЭТА МАГЧЫМА?

*Ідэя ўсеагульнай мовы, вылучаная ходам грамадскага развіцця, займае людзей ужо многа стагоддзяў. Па гэтай праблеме выказваліся буйныя філосафы Р. Дэкарт, Г. В. Лейбніц, буйнейшыя лінгвісты — Г. Шухардт, І. А. Бадуэн де Куртэнэ, А. Мейе, О. Есперсен, Э. Сепір, вядомыя ўсяму свету пісьменнікі — Л. Талстой, М. Горкі, А. Барбюс, Г.-Уэлс і многія іншыя выдатныя прадстаўнікі культуры і грамадскай думкі. Пачынаючы з XVII стагоддзя і да нашых дзён было прапанавана звыш 500 розных праектаў стварэння міжнароднай мовы. Усё новыя і новыя варыянты ўсеагульнай вуснай і пісьмовай мовы працягваюць штогод друкаваць у розных краінах свету. Але ва ўмовах класава-антаганістычнага грамадства праблема агульначалавечай мовы не можа быць правільна і паспяхова вырашыцца.*

*Як і калі ўзнікне агульная мова людзей, якой яна павінна быць? Стане агульначалавечай адна з нацыянальных моў, ці існуючыя мовы будуць аб'яднаны ў адну? Ці можна такую мову стварыць наогул? Дапаможная міжнародная і адзіная агульначалавечая — розныя гэта мовы ці адна і тая ж у розных перыядах гісторыі і ў розных функцыях?*

*На ўсе гэтыя і іншыя пытанні, якія датычацца міжнароднай мовы, у манаграфіі Э. П. Свадоста «Як узнікне ўсеагульная мова» прапануюцца абгрунтаваныя адказы (выдавецтва «Навука», Масква, 1966).*

*Асобныя главы даследавання прысвечаны такім праблемам, як вялікая роля агульначалавечай мовы для далейшага збліжэння і канчатковага аб'яднання сацыялістычных нацый свету і ў будаўніцтве агульначалавечай культуры новага грамадства, прымяненне законаў матэрыялістычнай дыялектыкі да моўнага развіцця грамадства, асабліва ў сучасны перыяд пераходу чалавецтва ад капіталізма да камунізма,*

*На яскравых прыкладах аўтар паказвае, што агульная мова ўсіх народаў свету—праблема не далёкага будучага, а ўжо нашай эпохі—эпохі рэвалюцыйнагаператварэння свету.*

Р. КАЗАКЕВІЧ.



ВОСЕНЬ НЕ ГРЫБНАЯ, АЛЕ... Фотаэцюд А. КАДЗЕТА.

Рэдактар М. І. ІОСЬКА.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 112, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 1221. АТ 01096.